# ПАЗАКЛАСНАЕ МЕРАПРЫЕМСТВА "ХАТА З БАЦЬКОЎСКАЙ ДУШОЮ"

**Сінкевіч Ірына Леанідаўна,**
настаўнік вышэйшай катэгорыі
ДУА "Суйкаўская базавая школа Віцебскага раёна"

***Калі жыццёвыя сілы пакідаюць цябе, дакраніся да сваіх вытокаў – сцен бацькоўскага дома, нават калі ён пусты***

*Нельга быць патрыётам сваёй Радзімы, свайго народа і не ведаць пра ўсё тое, што здабыта ім за шмат стагоддзяў нялёгкага існавання. Што страцілі мы з нашай спадчыны? Што за свой век прыдбалі? Вяртацца да старога ўкладу жыцця, зразумела, не варта, але ведаць, як жылі нашы дзяды-прадзеды, трэба абавязкова. Мерапрыемства "Хата з бацькоўскай душою" дапаможа вучням дакрануцца да часткі матэрыяльнай культуры беларусаў.*

**Мэты:**

» пашырыць веды вучняў аб культуры і традыцыях беларускага народа;

» пазнаёміць дзяцей з вераваннямі і абрадамі, звязанымі з пабудовай і засяленнем беларускай хаты;

» пазнаёміць з унутранай прасторай хаты і даць уяўленне пра тое, што кожны яе атрыбут: парог, акно, бэлькі, чырвоны кут, печ, стол – мелі сваё прызначэнне;

» выхоўваць пачуццё нацыянальнай годнасці, беражлівыя адносіны да спадчыны беларусаў.

**Абсталяванне:** фотаздымкі беларускай хаты, відэазапіс "Беларуская хата", запіс песні "Мой родны кут", рэчы хатняга ўжытку, абразы, ручнікі.

Сцэна стылізавана пад беларускую хату. На покуці вісяць абразы, упрыгожаныя ручнікамі. Ля ўвахода знаходзіцца печ. На сценах развешаны ручнікі. На стале, падлозе стаяць рэчы хатняга ўжытку.

Парог, высечаны з успамінаў,
Астаўся за мной;
Дзверы, на завесах цвыркуновай песні,
Асталіся за мной;
Вокны, зашклёныя вачамі блізкіх,
Асталіся за мной;
Хата, пакрытая крыламі ластавак,
Асталася за мной, –
Як жа мне не азірнуцца назад,
Нават калі б я застыў
Слупом солі?

М. Танк

Гучыць песня "Мой родны кут". Настаўнік і 2 вучні выходзяць на сцэну.

**Вучань 1.** Добрай раніцы ўсім Вам,
Нашы ягамосці!
Дзякуем, што Вы да нас
Завіталі ў госці.

**Настаўнік.** Добры дзень, дзеці! Добры дзень, нашы дарагія госці! Мы вельмі рады бачыць вас у нашай утульнай зале. Мерапрыемства, на якое мы вас сёння запрасілі, называецца "Хата з бацькоўскай душою".

Настаўнік чытае радкі эпіграфа, затым звяртаецца да вучняў:

– Скажыце, калі ласка, як вы разумееце радкі эпіграфа?

(Вучні тлумачаць сэнс радкоў М. Танка)

**Настаўнік.** А зараз запрашаем вас у нашу хату. Перад тым, як вы зойдзеце ў яе, мы раскажам вам, якіх традыцый прытрымліваліся нашы продкі, калі будавалі хату, і як адбываліся ўваходзіны.

**Вучань 1.** Для будаўніцтва хаты трэба было выбраць месца і адпаведныя матэрыялы. Гэта ж колькі трэба было ўсяго ведаць і прадбачыць!

Дрэва на будоўлю нашы прадзеды ссякалі тады, калі месяц знаходзіўся ў сваёй апошняй квадры. Лічылася, што тады яно будзе моцнае. Нарыхтоўваць бярвенне ў маладзік было непажадана: яно паслужыць нядоўга. Дрэва, спілаванае паміж квадрамі месяца, паточыць шашаль.

Людзі меркавалі, што нельга на пабудову браць вывернутае непагодаю дрэва, бо чорт абраў яго для сябе і разам з ім можа перасяліцца ў новую хату. Таксама нельга было выкарыстоўваць дрэва, якое звісала над іншым, бо будынак можа хутка

згарэць. Вопытны селянін ніколі не браў і рыплівае дрэва, бо ў збудаванай з яго хаце людзі могуць часта паміраць ці заходзіцца ад кашлю. Не падыходзіла для гэтай мэты і дрэва, што, ссечанае, паваліласяна поўнач: у хаце памрэ чалавек, а ў хляве – жывёла. Самымі лепшымі месяцамі для нарыхтоўкі драўніны лічыліся сакавік і красавік.

У некаторых раёнах існавалі абрады праверкі "ліхіх" месцаў. Гадалі наступным чынам: на зямлю ставілі рабром тры хлябы і каталі іх. Калі ўсе яны падалі верхняй коркай уверх – ставіць хату можна, а калі не, то лепш гэта месца пакінуць.

Пры будаўніцтве першы камень ці бервяно клаў самы старэйшы член сям'і. Абавязкова ён насыпаў пад яго горстку зерня. Пры закладцы хаты пад вуглы хавалі грошы – для багацця, шэрсць – для цяпла, ладан – для святасці.

**Настаўнік.** Лазой згінаючыся ніцай,
Дзяды прасілі абразы:
– Не дай, Бог, тры разы жаніцца,
Не дай сяліцца тры разы!..

Сапраўды, нашы продкі свята верылі ў тое, што сям'я будзе жыць шчаслівa і багата, калі прытрымліваўца пэўных правілаў пры засяленні.

**Вучань 2.** Пераезд у новую хату лічыўся пачаткам новага жыцця. Раней, у старажытнасці, меркавалі, што любое пачынанне толькі тады будзе ўдалым, калі атрымае благаслаўленне багоў. Іх трэба было ўміласцівіць ахвярай. Нашы продкі верылі: хто першым у хату ўвойдзе, той першым у ёй і памрэ, таму ў жыллё сталі запускаць кошку. Існавала павер'е, што яна нейкім чынам звязана з нячыстай сілай, значыць, самой кошцы нічога не пагражае.

У новую хату пераязджалі раніцай ці ў поўдзень. Самым шчаслівым днём для гэтага лічыўся дзень Сімяёна Столпніка (14 верасня), дзень запальвання зімняга агню – запальванне печы ў хаце пасля лета. Спрыяльным быў і дзень Увядзення ў храм Багародзіцы – 4 снежня. Пераход у новы дом прымяркоўваўся да поўні.

Звычайна першым ішоў гаспадар з гаршком, у якім быў жар з вуголлем. За ім хатнія неслі маёмасць. Гаспадар абносіў гаршчок уздоўж сцен, ставіў яго на прыпечак і адразу запальваў у печы. А напярэдадні ў новую хату запускалі пеўня ці курыцу. Калі певень спяваў, гэта лічылася добрым знакам, а калі не – дрэнным.

Пры ўваходзінах усе чатыры куты мазалі мёдам, каб жыццё было салодкае. Нават існавала традыцыя ўкрасці ў суседзяў качаргу і прынесці яе ў новы дом. Але перш за ўсё абавязкова заносілі абраз і стол. У асобных раёнах Беларусі сустракаўся і такі звычай: пры гэтым абрадзе праз адчыненыя дзверы кідалі клубок нітак. Трымаючыся за нітку, члены сям'і па старшынстве ўваходзілі ў хату.

Сярод беларусаў існавала такая прымета: хто ў дзяцінстве разбураў птушыныя гнёзды, той за жыццё зменіць столькі сяліб, колькі гнёздаў разбурыў.

**Настаўнік.** А зараз мы прапануем вашай увазе сцэнку "Уваходзіны".

Сцэнка "Уваходзіны"

(Пасярод хаты стаіць лаўка. На ёй сядзяць старыя: бабуля і дзед. Убягае дзяўчынка, садзіцца на лаву.)

**Дзяўчынка.** Бабулечка, а куды гэта мае мама і тата сабраліся?

**Бабуля.** То ж, дзетка, на ўваходзіны да цёткі Ганны.

**Дзед.** Добрую хату Сцяпан пабудаваў. Ды і пару выбраў добрую, каб засяліцца: акурат зараз поўня.

**Бабуля.** Казалі, што яны ўсё чэсць чэсцю зрабілі: і ікону са свечкамі ўносілі, і пеўня праз акно ўпусцілі. А ён і закукарэкаў. Добры знак. І бацюшку прывозілі, каб асвяціў новую хату.

**Дзед.** А ці помніш, старая, як мы засяляліся? Твая маці прыйшла. Усе вуглы мёдам мазала, каб у хаце соладка жылося.

**Дзяўчынка.** А што маці будзе дарыць цётцы Ганне?

**Бабуля.** Пасцілку цудоўную купіла. А раней дык усё саматканае дарылі, мэблю самаробную. Мой дзядзька, помніцца, лаву цудоўную на ўваходзіны прынёс.

**Дзед.** А помніш, бабка, колькі жывёлы нам на ўваходзіны прынеслі! І гусей, і цялушку, і парасятак!

**Дзяўчынка.** Ну і дзіўныя падарункі! А раскажыце яшчэ што-небудзь цікавае пра тое, як хату будавалі.

**Дзед.** Ну то слухай. Хату ніколі не ставілі на скрыжаванні дарог. Такое месца называлася "чортавымі шляхамі". Яно было непрымальным для жылля, бо лічылася прыстанішчам ведзьмаў. Было дрэнным і месца, дзе адбылося забойства ці знайшлі чалавечыя косці.

**Бабуля.** Яшчэ мой тата казаў: "Будуй хату на тым месцы, якое аблюбавала рагатая жывёла."

**Дзяўчынка.** А на якім месцы вы сабе хату стаўлялі?

**Бабуля.** Узяў дзед гаршчок з мёдам і паставіў на ноч на двары. Прыйшлі мы раніцай і ўбачылі: там мурашак-мурашак! Вось і сталі там будавацца.

**Дзяўчынка.** А калі б мурашак там не было?

**Бабуля.** То другое месца шукалі б.

**Настаўнік.** Вось вы і даведаліся, як хата будавалася і як адбывалася засяленне. А зараз мы запрашаем вас паглядзець на тое, як выглядала наша беларускае жыллё знутры. Для гэтага мы прапануем вашай увазе відэазапіс "Беларуская хата".

**Настаўнік.** Скажыце, калі ласка, а вашы хаты такія, як выглядае ў відэазапісе? Што змянілася, на ваш погляд, у жытле, у якім вы жывяцё зараз?

А цяпер вы даведаецеся аб прызначэнні кожнай з частак хаты.

**Вучань.** Як у храме, так і ў звычайнай сялянскай хаце існаваў дакладны парадак. Кожнае акно, кожная бэлька, куточак, лава, ложак, печ, стол, парог мелі сваё прызначэнне і былі звязаны з вераваннямі нашых продкаў.

На большай частцы Беларусі пашырана традыцыя рабіць у доўгай (з двара) сцяне хаты 3 акны. Гэта невыпадковы сімвал. Ён увасобіў у сабе тры пакаленні, якія звычайна жылі пад адным дахам. Каб пераканацца, што гэта так, трэба ўважліва прыглядзецца да інтэр'ера жытла. Уздоўж супрацьлеглай (без вокнаў) сцяны мы заўважым атрыбуты пражывання кожнага з трох пакаленняў: 2 ложкі і палаці на печы. Бэлькі не толькі ўтрымлівалі дошкі столі, але і дзялілі ўнутраную прастору хаты на адпаведныя зоны: ад парога да першай бэлькі (каля печы) – для гасцей, паміж першай і другой бэлькай – для гаспадароў, ну а трэцяя бэлька выконвала ролю радаводнага дрэва жыцця і памяці. Пад ёю жывыя звычайна не сядзелі.

Менавіта ў 1-ю бэльку (бліжэй да печы) убіваўся крук, да якога прымацоўвалася люлька для немаўля. Бэлька яднала два пакаленні. З аднаго боку старэйшае (як носьбіт народнай мудрасці), а з другога – малодшае, якому гэту мудрасць трэба перадаць.

У кожнай хаце былі два сімвалы жыцця – печ і стол, якія звычайна знаходзіліся па дыяганалі адзін ад аднаго. Стол часцей за ўсё стаяў бліжэй да самага свяшчэннага месца хаты.

**Вучань 4.** У паўсядзённым і святочным жыцці сялянскай сям'і важную ролю выконваў і парог. Познім калядным вечарам дзяўчаты перадшлюбнага ўзросту збіраліся ў той хаце, дзе звычайна спраўлялі вячоркі, і варажылі, якой першай пашчасціць замуж пайсці. На парог хаты клалі па аладцы, адчынялі дзверы і клікалі сабаку. Чыю аладку ён з'есць першай, тая і замуж хутчэй пойдзе.

Калі нават і сёння мы зачэпімся за парог, адразу зазначаем: павінна нешта здарыцца.

Каб у хату не заходзілі людзі з адмоўнай біяэнергетыкай, старыя раяць у парог уваткнуць дзве іголкі. Перад тым, як адправіцца да нявесты, малады праходзіў пад ручніком, у абодва канцы якога было закручана па бохане хлеба і які на высока ўзнятых руках трымалі яго бацькі. Дык вось гэта рытуальная арка чакала хлопца каля парога. Праходзячы пад ёй, малады павінен быў прыгнуцца, схіліць галаву – пакланіцца продкам свайго роду. Шырока вядома павер'е, што мужчыны ні ў якім разе не падаюць адзін аднаму рукі праз парог пры сустрэчы або на развітанне, а гаспадыня не мае права падаваць якія-небудзь рэчы.

**Настаўнік.** Большасць з нашых сучаснікаў не ведае, чаму парог стаў такім незвычайным месцам у хаце. Адказ можна знайсці, калі ўважліва ўгледзецца і паразважаць пра ніжні ўзровень пабудовы жылля. Яшчэ і сёння ў многіх вясковых хатах адразу за парогам ёсць вечка, праз якое можна трапіць у пограб, дзе на працягу халоднага часу захоўваюцца садавіна і гародніна, грыбы, слоікі з варэннем. Але гэта цяпер. А значна раней, недзе паміж VI–XIV стагоддзямі, пограб з'яўляўся месцам пахавання памерлых. Гэта быў перыяд крэмацыі. Нябожчыка спальвалі на рытуальным месцы, а урну з прахам хавалі пад парогам. Значыць, гістарычна парог – зона захавання продкаў.

А ці ведае хто-небудзь з вас, адкуль узяліся вокны? Як яны ўзніклі?

**Вучань 5.** Расказвае легенду пра ўзнікненне вокнаў.

Легенда пра ўзнікненне вокнаў

Калісьці людзі не ўмелі будаваць хат. Пасля Вялікага патопу сям'я Ноя пачала павялічвацца, і ён збудаваў хаціну, што спадабалася іншым людзям, і яны таксама распачалі будоўлю. Трэба сказаць: у тагачасных хатах не было вокнаў.

Аднаго разу нейкая жанчына, схапіўшы рэшата, бегала па вуліцы, каб злавіць сонечны промень для асвятлення пакояў. Раптам з'явіўся анёл і прарубіў сякераю ў хаце дзірку. Жанчына залямантавала: "Як жа я цяпер тут сагрэюся?" Тады анёл падумаў і параіў жанчыне ўзяць драўляную раму і нацягнуць на яе свіны пузыр – у жыллі будзе і светла, і цёпла.

З таго часу і пачалі будаваць хаты з вокнамі, а таксама узнікла вера ў тое, што ў вокны гаспадароў глядзяць анёлы, таму акенца павінна быць заўсёды чыстае.

**Вучань 6.** Сцены, дах, падлога як часткі жытла аддзялялі прастору хаты ад знешняга свету, а вокны, як і дзверы, наадварот, звязвалі знешні свет з гэтай прасторай і павінны былі выходзіць на ўсход ці на поўдзень. Гэта тлумачыцца тым, што да сцяны з вокнамі прымыкаў чырвоны кут, дзе віселі абразы, а ён павінен быў абавязкова выходзіць на ўсход, на Божую старану.

Тое, што акно выходзіла на Божую старану, вызначала яго святасць. Яна выяўлялася і ў абавязковай іх колькасці: тры – у гонар Святой Тройцы. Больш рабіць не належала. А калі ўзнікала такая неабходнасць, то трэба было атрымаць благаславенне святара. Лічылася грахом што-небудзь выкідваць з акна, пляваць праз яго.

Такім чынам, вокны мелі сакральнае значэнне, але ў той жа час выступалі і слабым месцам хаты, бо праз іх маглі пранікнуць унутр варожыя знешнія сілы. Каб засцерагчыся ад іх, людзям патрабаваўся цэлы комплекс спецыяльных сродкаў. Вельмі важнай у гэтым плане з'яўлялася ахоўная

дэкаратыўная сімволіка. Засцерагальную ролю выконвалі элементы ў выглядзе ромбаў, якія азначалі зямлю, хвалістыя лініі, якія сімвалізавалі нябесную ваду і дождж. Выявы галоў коней лічыліся сімвалам шчасця, а птушкі – сямейнага дабрабыту.

Кантакт са знешнім светам праз дзверы ў народным уяўленні ўспрымаўся як натуральны працэс, а сувязь з наваколлем праз вокны мела рытуальны, абрадавы характар. Існуе думка, што праз дзверы праходзяць людзі, а праз вокны прыходзяць з нябёс душы памерлых продкаў, таму ў час святкавання асенніх Дзядоў лыжку кожнай стравы адкладвалі ў асобную пасудзіну, якую ставілі на падаконнік для памерлых. Калі ў час абрадавай вячэры зазвініць шыба, то лічылі: душы продкаў прыйшлі і нябачна прысутнічаюць на абрадзе.

А вось на Радуніцу ў вокнах хат вывешвалі ручнікі, каб душы нябожчыкаў маглі пазнаць жытло сваіх родных, а для большай урачыстасці прыбіралі кветкамі. Такім чынам, акно было важнай часткай сялянскай хаты.

**Настаўнік.** А хто з вас можа адгадаць такую загадку:

Бог жыве на небе,
Бог жыве ў царкве.
А ў вясковай хаце
Дзе ён, Бог, жыве?

**Настаўнік.** Правільна. Гэта покуць або чырвоны кут.

Вучань чытае верш "Свечка на покуці".

Светла было на душы,
Цешыла хатка-святліца.
"Чалавек, не грашы!" –
Напамінала бажніца.

Ціхім, спакойным агнём,
Не ведаючы зацьмення,
Свечка гарэла і днём,
Як божае благаславенне.

Новы прыйшоў гаспадар,
Не свечка, адкрытая Богу,
А металічны ліхтар
Яму асвятляе дарогу.

Гмах падняўся, як груд,
На месцы хаткі-святліцы,
Толькі нямашака тут
Ні покуці, ні бажніцы.

Свечку час патушыў –
І ў храм не вядзе сумленне,
І пацямнела ў душы
Без Божага благаславення.

**Настаўнік.** Што ж сабой уяўляе чырвоны кут?

**Вучань 7.** Покуць – пачэснае месца ў хаце. Гэта куточак храма ў ёй. З гэтай нагоды ў верхняй частцы кута заўсёды вісеў абраз, абавязкова пакрыты прыгожым саматканым ручніком. Покуць спрадвеку ачышчала і ўзвышала чалавека, рабіла яго лепшым.

Кожная святочная падзея або рытуал, звязаныя з асноўнымі этапамі чалавечага жыцця, разгортваліся ў непасрэднай блізкасці ад чырвонага кута. Тры калядныя куцці падчас падрыхтоўкі святочнай вячэры стаялі на покуці, на лаве, засланай сенам і белым ручніком. Там жа знаходзілася "бабіна каша" як асноўны атрыбут радзінна-хрэсьбіннай абраднасці. Бадай, самую значную ролю выконваў чырвоны кут у час святкавання вяселляў, а таксама калі спраўляліся пахавальна-памінальныя сталы. На вяселлі маладыя сядзелі менавіта на покуці, дзе як бы сыходзіліся ў адзінае цэлае дзве сцяны – сімвалы двух родаў. Сцяна з боку двара сімвалізавала тэрыторыю гаспадароў, таму ўздоўж яе і садзіліся госці з боку жаніха. Нявеста прыходзіла "з вуліцы". Таму прадстаўнікі яе роду рассаджваліся ўздоўж сцяны з двума вокнамі.

На пачэсны кут і сёння запрашае Бога, каб благаславіў маладых, вясельная песня:

Не стой, Божа, за дзвярмі,
Да ідзі, Божа, у хату.
Да сядзь, Божа, на куце,
Да дай долю маладзе.

За ўсё жыццё чалавек меў права толькі двойчы заняць месца ў чырвоным куце. Другі раз – адразу ж пасля смерці. Спачатку нябожчыка клалі на лаву, а потым, калі была падрыхтавана труна, перакладвалі ў яе і зноў-такі ставілі ў кут, галавой да абразоў.

За абразамі, што віселі ў чырвоным куце, звычайна захоўваліся асноўныя свяшчэнныя атрыбуты ахоўна-засцерагальнага характару. Тут ляжалі грамнічныя свечкі, у белай хусцінцы знаходзілася жменька зямлі са следам хлопца, які пайшоў у войска. За абразамі трымалі бутэлечку са свянцонай вадою – лекамі ад усіх хвароб.

У паўсядзённым жыцці тут, за сталом, тройчы на дзень збіралася сям'я, каб падсілкавацца не толькі фізічна, але і духоўна.

**Настаўнік.** А цяпер патлумачце, чаму так гавораць: "Сівой барадзе месца на куце", "Покуць – каб маліцца, а не галёкаць", "Добраму чалавечку добра і ў запечку, а ліхаце кепска і на куце".

А зараз адгадайце загадку:

Яна галодная – хата халодная,
Яна пад'ела – у хаце пацяплела.

(Вучні даюць адказы.)

**Вучань 8.** Печ – сімвал жыцця, жыватворчы ачаг, які сілкаваў сям'ю энергіяй сонца. Ёй, як галоўнаму захавальніку жыццёвай эстафеты таго ці іншага роду, аддавалася даніна пашаны практычна ўсіх важнейшых святкаванняў. Печ асэнсоўвалася як "жаночае" месца ў хаце. Сваты, збіраючыся

ісці сватаць дзяўчыну, дакраналіся да печы ў сваім доме, "каб быў лад". Прыйшоўшы ў хату будучай нявесты, яны перш за ўсё набліжаліся да печы і ціхенька звярталіся да яе: "Печ, печ, памажы!" Калі малады сватаў дзяўчыну, яе маці хавалася за печчу. Жаніх тройчы звяртаўся да маці нявесты з просьбай даць канчатковую згоду на шлюб. Маці пагаджалася толькі тады, калі за трэцім разам будучы зяць адорваў яе грашамі. Маладая ж задоўга да замужжа павінна была сплесці спецыяльны пояс, які кідала на печ, упершыню пераступіўшы парог свайго суджанага. Тым самым яна быццам гаварыла прысутным: з гэтага моманту мяне будзе ахоўваць ачаг новай хаты.

У некаторых вёсках і цяпер існуе старадаўні звычай: маладая на другі дзень пасля вяселля беліць печ у хаце маладога. Гэтым яна імкнецца "задобрыць" печ, наладзіць адносіны з ёй, а значыць, з новай сям'ёй.

Нараджэнне і першыя гады жыцця дзіцяці таксама цесна звязаны з пячнымі рытуаламі. Так, пры першым купанні нованароджанага ў начоўкі клалі 9 вугольчыкаў. На працягу першай паловы года ваду пасля купання дзіцяці вылівалі ў падпечак. У многіх мясцінах Беларусі валасы пасля першага падстрыгання немаўляці спальвалі на прыпечку. А куды кідаюць малочныя выпаўшыя зубы? У запечак з прыгаворам: "Мышка, мышка! На табе зуб касцяны, а мне дай жалезны!"

Важнае месца займала печ і ў пахавальнай абраднасці. Так, вяртаючыся з могілак, родныя і блізкія нябожчыка збіраліся на памінальную трапезу. Але перш чым сесці за стол, усе прысутныя па чарзе падыходзілі да печы і аберуч датыкаліся да яе бруля. Святкаванне восеньскіх Дзядоў пачыналася тым, што гаспадар падыходзіў да загнета, заглядваў у комін і зваў душы памерлых продкаў.

Трэба адзначыць, што з асаблівай увагай дамачадцы адносіліся да неабходнасці пастаянна захоўваць цяпло. Меркавалі, што калі гарачыя вугольчыкі, загорнутыя попелам на ноч, патухнуць, сям'ю напаткае няшчасце.

Дазвалялася патушыць агонь у печы толькі на Вялікдзень і Купалле – у тыя найвялікшыя святы, якія адпавядалі фазам найвышэйшага росквіту Сонца.

**Настаўнік.** А хто з вас ведае, як называецца верхняя гладкая, як ток, частка печы, – любімае месца дзяцей і ката? Гэтае месца называецца чарэнь. Якраз тут, на чарэні, і ўбачыла ката смяшынка-заклічка:

Злазь, каток з чарэні,
Не ўцякай у сені.
Ідзі, каток,
У наш гурток,
Пачытаем кніжку
Пра ката і мышку.

Любіў пагрэцца зімою на цаглянай ляжанцы і гаспадар, пра што сведчыць жарт са старога календара:

Жонка будзіць мужа, які спіць на печы:

– Мікіта, чуеш, пеўні спяваюць. Уставай!

– Няхай сабе спяваюць, калі ім не спіцца, – адказаў муж і перавярнуўся на другі бок…

А зараз патлумачце, чаму так гавораць: "Са сну хлеба не пякуць", "Як наварыць Луця, то не паесць і цюця".

**Настаўнік.** А зараз наша мерапрыемства падыходзіць да завяршэння. Час не стаіць на месцы. Ён ідзе. Мяняецца жыццё і разам з ім старажытныя традыцыі ў адносінах да кампанентаў жылля. Канструкцыі жылля змяніліся ў залежнасці ад асаблівасцей і патрэб часу. На жаль, забываюць людзі пра старажытныя абрады, якія ў мінулым адбываліся на парозе хаты, ля печы, у чырвоным куце… Наўрад ці хто баіцца сёння пранікнення ў хату нячыстай сілы. Але ж паняцце "бацькоўскі парог" як увасабленне ўваходу ў родную хату засталося, і кожнага, хто вяртаецца ў бацькоўскую хату, на парозе ахоплівае хваляванне ад сустрэчы са светам роднага дома, са светам маленства. Дык давайце ж спрыяць таму, каб традыцыі нашага народа не зніклі бясследна. На гэтым бацькоўская хата зачыняе свае дзверы.

### Літаратура

1. Котович, О.В. Золотые правила народной культуры / О.В. Котович, И.И. Крук. – 8-е выд. – Минск: Адукацыя і выхаванне, 2013. – 591 с.

2. Крук, І.І. Сімволіка беларускай народнай культуры / І.І. Крук. – Мінск: Беларусь, 2003. – 350 с.

3. Маляўка, М.А. Сядзіба, або Хата з матчынай душою / М.А. Маляўка. – Мінск: Юнацтва, 2002. – 140 с.